
Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

Газета Слонімская

№48 (181). 23 — 29 лістапада 2000г. Масава-палітычны штотыднёвік http://gs.promedia.minsk.by Кошт 100 руб.

Новы расклад руху гарадскога транспарту

ЧЫТАЙЦЕ НА 8 СТР.

ЗДАРЭННІ

Начны пажар

У ноч з 20 на 21 лістапада ў Слоніме на вуліцы Заслонава факелам успыхнуў хлеў.

Пабудова згарэла, засталіся толькі цагляныя сцены. Каб не пажарныя, то бяда магла быць значна большай, бо побач стаяць жылыя дамы.

Разукамплекталі

За адну ноч 17 лістапада на Брэсцкай вуліцы былі разукамплектаваны тры аўтамабілі.

З дзвюх легкавушак злачынцы знялі колы, з трэцяй — укралі свечы і аўтамагнітолу.

Два чалавекі загінулі, адзін паранены

На мінулым тыдні на Слонімшчыне здарыліся тры аварыі, у выніку якіх два чалавекі загінулі, а адзін з траўмамі дастаўлены ў бальніцу.

Каля вёскі Паўлава аўтафургон, якім кіраваў грамадзянін Польшчы, наехаў на пажылую жанчыну, якая памерла на месцы. Амаль у той жа час у Слоніме на праспекце Незалежнасці "Опель" серабрыстага колеру збіў пешахода. Іншамарка з месца здарэння з'ехала, а пакалечанага чалавека адвезлі ў бальніцу.

17 лістапада 24-гадовая жанчына, кіруючы аўтамабілем, збіла мужчыну, які атрымаў цяжкія траўмы. Выратаваць яго медыкі ўжо не змаглі.

Здарылася гэта вечарам на вуліцы Касаўскі тракт.

Валодзя ЯНЧУК

САЛОДКІ СТОЛ У ДОМЕ САВЕТАЎ



Фота Віталя Гіля

Усё смачнае — дзецям

У аўторак, 21 лістапада, у слонімскім доме Саветаў адбылася выстава-прэзентацыя навагодніх падарункаў ААТ "Світанак".

Прэзентацыю распачаў дырэктар "Світанка" Васіль Духоўнік. Ён адзначыў, што слонімскае гандлёвае таварыства ўжо падрыхтавала да навагодніх свят пяць тысяч дзіцячых падарункаў для Слоніма і тры тысячы для Ваўкавыска. На выставе было прадстаўлена 150 відаў ласункаў.

Акрамя кандытарскіх вырабаў "Світанак" падрыхтаваў да Новага года і Каляд штучныя елачкі розных памераў, коштам ад пяці тысяч рублёў і даражэй.

Выставу наведалі прадстаўнікі больш за 50 арганізацый Слонімшчыны, а таксама кіраўніцтва гарвыканкама. Многія наведвальнікі мелі магчымасць заказаць для сваіх арганізацый навагоднія падарункі, шампанскае і елкі. Адным словам, слонімскія дзеткі без цукерак не застануцца, былі б грошы.

Сяргей ЧЫГРЫН

НАВІНЫ

Гаркавая стала старшынёй

Стала вядома прозвішча новага старшыні Слонімскага гарсавета. Ім стала Людміла Гаркавая, якая дагэтуль працавала начальнікам інспекцыі дзяржаўнага падатковага камітэта па Слоніму і Слонімскаму раёну.

"ГС" ужо пісала (№ 45, 2-8 лістапада 2000 г.), што былы старшыня гарсавета Войцех Угрыновіч змяніў месца працы, а найбольш верагодным кандыдатурай на гэтую пасаду разглядалася якраз Гаркавая. Так і сталася. Пазачарговая сесія гарсавета тайным галасаваннем выбрала Людмілу Мікалаеўну сваім старшынёй.

Сяргей ЁРШ

Прэм'ера фільма "Момант ісціны"

22 лістапада ў Мінску адкрыўся міжнародны кінафестываль краін СНД і Балтыі "Лістапад-2000".

На ім адбудзецца прэм'ера фільма М.Пташука "У жніўні 1944" ("Момант ісціны"), здымкі якога праходзілі і ў Слоніме. Аб гэтым карэспандэнту "ГС" па тэлефоне паведаміў намеснік міністра культуры РБ Юрый Цвяткоў. Ён сказаў, што гэты фільм уключаны ў конкурсную праграму фестывалю, а на шырокім экране стужка будзе дэманстравацца ў лютым-сакавіку 2001 года.

Сяргей ЧЫГРЫН

НАША ІНТЭРВ'Ю

Уладзімір Раманоўскі:

"Мяне радуе, што ў Слоніме расце плеяда добрых веславальшчыкаў"



Уладзімір Раманоўскі — адзін з самых славутых слонімскіх спартсменаў, алімпійскі чэмпіён па веславанню 1976 года. Цяпер ён жыве ў Мінску, працуе начальнікам нацыянальнай каманды Беларусі па веславанню на байдарках і каноэ. Нядаўна ў Слоніме праходзілі рэспубліканскія спаборніцтвы па веславанню на байдарках і каноэ на прыз алімпійскага чэмпіёна. Мы пацікавіліся ў Уладзіміра Раманоўскага, каму належыць ідэя правядзення такога турніру.

— Ідэя гэта належыць былому дырэктару спартыўнай школы Мікалаю Мікалаевічу Дуброўскаму (цяпер нябожчыку), — гаворыць Уладзімір Раманоўскі. — Яе падтрымаў рэспубліканскі камітэт, і з 1996 года традыцыйна, штогод восенню, праводзяцца гэтыя спаборніцтвы. Я лічу, што падобныя спаборніцтвы павінны праводзіцца ў прысутнасці алімпійскіх чэмпіёнаў. Маладое пакаленне павінна бачыць герояў — алімпійскіх чэмпіёнаў. Гэта будзе нагляднымі ўрок для іх і стымул у далейшай падрыхтоўцы, у росце спартыўнага майстэрства.

(Працяг на 12 стр.)

БЮДЖЕТНИКОВ ПОДДЕРЖАТ

В первой декаде декабря этого года заработная плата жителей Беларуси повысится на 40 процентов. Об этом заявил во время недавнего рабочего визита в Могилев Александр Лукашенко.



Фота Віталя Гіля

Он подтвердил, что к середине 2001 года средняя зарплата в Беларуси должна достичь уровня 100–110 тысяч белорусских рублей в месяц. Но уже в декабре этого года она возрастет на 40 процентов. Причем, это повышение оплаты труда в первую очередь коснется работников бюджетной сферы.

По подсчетам экономистов, повышение зарплаты обойдется республике в 625–650 миллиардов белорусских рублей. Кроме этого, Александр Лукашенко сообщил журналистам о подготовке проекта по выделению молодым специалистам беспроцентного кредита сроком на 5 лет, эквивалентного 500 долларам США.

БелаПАН

АКЦЫЯ

СЛОНІМЕЦ XX стагоддзя

Слонімскі край багаты на таленавітых людзей, сапраўдных патрыётаў сваёй Радзімы. Гэта палітыкі, пісьменнікі, вайскоўцы, краязнаўцы, педагогі, навукоўцы, спартсмены, работнікі сельскай гаспадаркі, прамысловасці і культуры.

Напрыканцы адыходзячага стагоддзя ў свеце стала ўжо традыцыяй падводзіць яго вынікі, вызначаць найбольш яркіх і славутых людзей. Мы вырашылі паспрабаваць вызначыць самага славутага слонімца стагоддзя. З гэтага нумара "Газета Слонімская" пачынае акцыю "Слонімец XX стагоддзя". Мы прапануем нашым чытачам прыняць удзел у гэтай акцыі. Званіце па тэл. 2-14-39, пішыце на адрас рэдакцыі: 231800 г. Слонім, вул. Я. Купалы, 5. Вы павінны да 20 снежня адказаць на адно пытанне: каго вы лічыце самым знакамітым слонімцам XX стагоддзя?

НАВІНЫ

Слонімцы вяртаюцца з турмы

На Слонімшчыну ўжо вярнуліся 32 амнісціраваных зняволеных.

Але гэтая лічба яшчэ не канчатковая, таму што колькасць слонімцаў, якія трапілі пад амністыю, значна большая. Аб гэтым карэспандэнту "ГС" паведаміў намеснік начальніка Слонімскага ГРАУС Іван Мялешка.

Усяго ў Беларусі пад амністыю трапілі 10700 чалавек. Адзін зняволены абыходзіцца бюджэту ў 21 тысячу рублёў у месяц. А ў зняволенні цяпер знаходзіцца 57 тысяч чалавек. З іх 10 тысяч – у следчых ізалятарах.

Сяргей ЧЫГРЫН

Упарадкавалі магілы Стаброўскіх

У мінулую нядзелю былі ўпарадкаваны магілы Стаброўскіх на могілках каля вёскі Орлавічы Слонімскага раёна.

Напомнім, што менавіта ў гэтых мясцінах калісьці быў маёнтак Язэпа Стаброўскага, вайскоўца, гісторыка, навукоўца, заснавальніка Слонімскага краязнаўчага музея. Тут і быў пахаваны наш славуты зямляк, а таксама ягоныя сваякі. У гэтым мерапрыемстве прымалі ўдзел падлеткі і іх кіраўнікі з клуба "Святліца", які дзейнічае пры грамадскім аб'яднанні "Воля да развіцця". Юныя журналісты і краязнаўцы ачысцілі магілы Стаброўскіх ад кустоўя і смецця.

Напомнім, што апошні раз магілы Язэпа Стаброўскага і ягоных сваякоў упарадкоўваліся групай слонімцаў у лістападзе 1994 года.

Сяргей ЁРШ

Вясковыя артысты вучыліся ў сталічных

Удзельнікі драматычнага гуртка Правамастоўскай школы наведалі Мінск.

Яны пабывалі ў дзяржаўным драматычным тэатры імя Янкі Купалы і там паглядзелі спектакль па п'есе Артура Вольскага "Нясцерка". Паездка была мэтанакіраванай. Школьныя артысты некалькі месяцаў таму зрабілі пастаноўку гэтага твора. Паглядзеўшы спектакль сталічных артыстаў, яны вырашылі ўдасканаліць сваё майстэрства. Кіруе драматычным гуртком настаўніца беларускай мовы Алена Касцянкоўская

Язэп ПАЛУБЯТКА

Кадравыя змены ў Мастоўскай міліцыі

Намеснік начальніка Мастоўскага РАУС, начальнік крымінальнай міліцыі Анатоль Кошур пераведзяны ў Гродзенскае УУС старшым оперупаўнаважаным па барацьбе з незаконным абаротам наркотыкаў.

На яго месца прызначаны маёр Віктар Пяцэвіч, які працаваў у Мастоўскім РАУС.

Антон МАКЕЙ

ФЕСТЫВАЛЬ НЕЗАЛЕЖНАЙ ПРЭСЫ



Ля стэнда «Газеты Слонімскай»

Фота Віталя Гіля

17-18 лістапада ў Мінску прайшоў Першы Рэспубліканскі фестываль беларускай незалежнай прэсы.

Яго ўдзельнікамі сталі каля 50-ці рэдакцый недзяржаўных СМІ з Мінска і розных рэгіёнаў рэспублікі, а таксама госці з Літвы і Расіі. Сваю газету на фестывалі прадстаўлялі і супрацоўнікі "ГС".

"Вы вельмі добра працуеце, і я думаю, што ў гэтым – гарантыя добрай будучыні Беларусі..." – сказаў у сваім прывітальным слове старшыня Саюза журналістаў Літвы Вілліюс Кавеляускас і дадаў, што ў Міжнароднай федэрацыі журналістаў (МФЖ) лічаць Беларускую асацыяцыю журналістаў (БАЖ) "самым баявым саюзам Еўропы".

Другі госць фестывалю, прэзідэнт Расійскага ПЭН-цэнтра Аляксандр Ткачэнка, адзначыў прафесійную мужнасць беларускіх журналістаў у той час, калі, па яго словах, у Расіі "будуюць капіталізм з сацыялістычным тварам, а ў Беларусі – сацыялізм з нечалавечым тварам".

Лепшыя выданні, а таксама асобныя журналісты атрымалі на фестывалі Ганаровыя дыпломы і прызы ад БАЖ, Беларускага ПЭН-цэнтра і Беларускага саюза прадпрымальнікаў і арэндатараў.

Мікола КАНАНОВІЧ

ТРИ ТОННЫ ЕЖЕГОДНО

Экологическая ситуация в Слониме вроде бы нормальная. И нет у нас особенно вредных производств и густо дымящих заводских труб не видно. Идиллия – на первый взгляд.

За таким внешним благополучием как-то теряется проблема, связанная со все более возрастающим с каждым годом количеством автотранспорта в городе. И не об одних только личных автомобилях разговор. В этом плане даже и порадоваться можно: растет, значит, благосостояние наших людей, раз уж они позволяют себе железного "коня" приобрести (не всегда первой молодости, правда). Настораживает и заставляет задуматься ежедневно проносящийся через город поток транзитных автопоездов. В день по ул. Шоссейной их проходит около 300, а это дает немалую прибавку к загрязнению воздуха выхлопными газами.

Вкратце напомню, чем опасен автомобильный выхлоп. В отработавших газах двигателя внутреннего сгорания содержится более ста вредных для здоровья человека веществ, и в первую очередь окись углерода (угарный газ), различные углеводороды, окись азота, ядовитые соединения свинца. Вдыхание этих веществ вредно действует на сердце и легкие.

Зная существующие нормы и стандарты, легко подсчитать, что эти 300 "дальнобойщиков" выбрасывают в воздух около 3000 килограмм вредных веществ в год. (Это по самым скромным подсчетам. Известно ведь, что самый токсический выхлоп, – когда двигатель работает на холостом ходу, что зачастую и случается, когда "фуры" к Барановичскому мосту с горочки накатом едут). Так вот, эти 3 тонны ежегодно загрязняют воздух на ул. Шоссейной. А при преобладающих западном и северо-западном ветрах, дышать этим же воздухом приходится и жителям близлежащих улиц Доватора и 17-е Сентября.

Кроме того, вносит свою, пусть и небольшую, лепту в загрязнение и резиновая пыль от износа шин. Пыль от стертых шин откладывается в канавах вдоль шоссе. Американские ученые установили, что примерно 2% почвы в придорожных канавах составляют резиновые частицы. А что происходит с сажей, составляющей по массе 25-30% продуктов износа шин? Она загрязняет воздух.

"Да ну! – скажете вы, – ерунда все это. Не задыхаемся ведь пока...". Что ж, для нас многое теперь, после чернобыльской катастрофы, ничего не значащей ерундой кажется. Только не может охрана окружающей среды, Природы, а значит и нас самих, как неотъемлемой её части, быть делом второстепенным. И неужели задумаемся мы об этом, лишь когда начнут болеть наши дети! А они уже болеют.

К сожалению, не удалось мне найти статистики о количестве лёгочных заболеваний и заболеваний сердечно-сосудистой системы жителей улиц Шоссейная, Доватора, 17-ое сентября и сравнить с общегородскими показателями. Но какими бы не были результаты такого сравнения, городу нужна объездная дорога. Нужна уже сегодня. А завтра будет необходима тем паче. Обещает ведь нам президент небывалый подъём экономики, рост промышленного и сельскохозяйственного производства. А значит и грузоперевозки вырастут, и наступит момент, когда город просто не сможет пропускать через себя многосотенный транзитный автомобильный поток...

Впрочем, дело как бы сдвинулось с мёртвой точки, и проектирование объездной дороги уже занимается Гроднооблстрой. Но кровной заинтересованности городского руководства в развитии дела не видно. И не в безразличии, наверное, ответ на это. Дорога – удовольствие дорогое и многохлопотное. Городской бюджет её строительство не потянет, а ждать дотаций из республиканского бюджета – практически безнадёжно.

Но особенно отчаиваться не стоит. Проблема "автомобиль и чистый воздух" многоплановая и решается целым комплексом мер. Совершенствование организации движения – лишь одна из них. Но есть ещё постоянный контроль за исправностью транспортных средств. Возможно, есть смысл организовать на въездах в город посты диагностической службы ГАИ по проверке автомобилей на токсичность выхлопа. В любом случае, проблему можно попытаться решить.

Валерий КОВАЛЕНКО

ЗДАРЭННІ

На мужа с... ножницами

В Дятлово во время ссоры жена ударила мужа в живот ножницами.

С ранением брюшной полости мужчина помещён в больницу.

"МВ"

Гарэлі "Жыгулі"

У мінулую нядзелю ў аднаго са слонімцаў загарэліся "Жыгулі".

Агонь пашкодзіў салон аўтамабіля. Прычына пажару – уцечка газу.

... і жылыя дамы

На мінулым тыдні ў Слоніме адбыліся пажары на вуліцах Маркса і Міцкевіча.

Агнём пашкоджаны веранда і адзін з жылых пакояў прыватных дамоў.

Сяргей ЧЫГРЫН

Задержаны торговцы взрывчаткой

Сотрудниками управления КГБ по Гродненской области пресечена попытка незаконного сбыта взрывчатых веществ.

По сообщению пресс-службы КГБ, оперативной группой сотрудников госбезопасности в ходе спецоперации на автостоянке по улице Озерское шоссе в Гродно были задержаны двое ранее судимых жителей города, один из которых ранее привлекался к уголовной ответственности за сбыт оружия. У них изъято 4 килограмма пластита в упаковках, 20 тротиловых шашек, 26 электродетонаторов и 2 подрывных электрических устройства. Торговцы взрывчаткой арестованы и заключены под стражу. В отношении их возбуждено уголовное дело по статье, которой предусмотрено лишение свободы на срок до пяти лет.

Ася КУНИЦКАЯ

НАВІНЫ

ЗАВЕРШИЛОСЬ ВЫДВИЖЕНИЕ КАНДИДАТОВ

На Гродненщине завершилось выдвижение кандидатов в члены Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь.

На совместных заседаниях президиумов районных и городских Советов депутатов и соответствующих райисполкомов выдвинуты восемь кандидатов. В их числе – председатель Гродненского облисполкома Александр Дубко, заместитель командира 28-го армейского корпуса Святослав Лис, заместитель директора ПО ЖКХ Сморгонского райисполкома Ирина Клепацкая, генеральный директор агрофирмы "Можейково" Лидского района Казимир Рахатко, директор ОАО "Дятловский сыродельный завод" Станислав Жульпо, директор ОАО "Ошмянский мясокомбинат" Тамара Филиппович, главный механик ОАО "Слонимская камвольно-прядильная фабрика" Василий Салевич и заведующий кафедрой нервных и нейрохирургических болезней Минского государственного медицинского института Федор Олешкевич.

Ася КУНИЦКАЯ

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.97г.
Заснавальнік і рэдактар Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі: 231800, г.Слонім, вул. Я.Купалы, 5.
Тэлефоны: рэдакцыі ....2-14-39 ....(017) 210-87-17
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.

Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісана да друку 22 лістапада 2000г. Час падпісання 7:00.
Надрукавана ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня", г. Слонім, вул. Хлюпіна, 16.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)
Наклад 9600 экз.
Заказ № 3587

E-MAIL:gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by

Газета Слонімская
23 — 29 лістапада, 2000г. № 48 (181)

Встреча через 50 лет

Недавно состоялась встреча бывших одноклассников СШ N2 г.Слонима 1950 года выпуска. Нас было 14 девушек и 14 юношей.

Большинство ребят связали свою судьбу с армией. Коля Крупко (коренной слонимчанин) дослужился до генеральского чина, Лёня Кормаков стал доктором экономических, а Вадим Писарев – кандидатом военно-технических наук. И другие ребята тоже нашли себе достойное место в жизни.

На встречу была приглашена бывшая учительница математики Любовь Ильинична Шункевич (Доронкина). Она тогда пришла в школу прямо со студенческой скамьи.

По разным причинам не все одноклассники смогли приехать. А некоторых, к сожалению, уже нет в живых.

Все мы были рады видеть друг друга через 50 лет. Посетили заветные слонимские места, любимые когда-то нами. Помянули ушедших из жизни. Сняли на память о встрече видеофильм. Убедились, ко всеобщей радости, что бывшие одноклассники, на долю которых досталось лихолетье войны и послевоенного времени, состоялись как люди.

Тамара ХИМИЧ

Так давайте же начнём с малого

Просто не мог не откликнуться на заметки из почты "Газеты Слонімскай" авторов В. Коваленко и жительницы Лобазовки Светланы.

Не скрою, вопросы, поднятые авторами, болезненны и стоят очень остро. Реконструкция автобусных остановок (именно о них шла речь в материале В. Коваленко) назрела уже давно. Существует и соответствующий план подготовки города к празднованию 750-летнего юбилея. Неоднократно депутаты горсовета (и я в том числе) поднимали этот вопрос не только на сессиях. К сожалению, значимых результатов в оборудовании или реконструкции городских автобусных остановок пока нет. Недавно увеличена остановка "Вокзал" и оборудована остановка "Энка". А вот улучшить ситуацию в плане движения городских автобусов будет сложно. Причин тут несколько.

Первая и одна из основных – финансовая. В бюджете на развитие городского транспорта просто нет денег. Социальная сфера, коммунальное хозяйство, транспорт находятся в сложном положении. Поправить их состояние за счёт налогоплательщиков тоже сложно. Подавляющая часть населения живёт от зарплаты до зарплаты.

Вторая причина – сегодня Советы просто не имеют законодательной инициативы. Советы стали представительными, а представлять интересы избирателей и обладать законодательной инициативой (быть законодательной ветвью власти) – две большие разницы.

Третья причина кроется в самих нас. Что каждым из нас сделано для изменения положения дел? Каждый из нас должен переживать за свой подъезд, дом, улицу, город.

Так давайте же начнём с малого – с уважения друг к другу.

Виктор ГЕРАСИМЧИК,
депутат городского Совета депутатов

РУКОВОДСТВУ КЛУБА ЕСТЬ НАД ЧЕМ ЗАДУМАТЬСЯ

Футбол я люблю с детства, на игры и тренировки "Коммунальника" хожу с самого начала существования клуба. Рабочую пару Сергея Грабуна и Геннадия Бабошкина нельзя сейчас сравнить с Алексеем Шубенком и Юрием Данилевичем. Если первые старались хоть как-то создать команду, чтобы она играла и радовала слонимских болельщиков, то вторые наоборот — убили их наработки...

Собранная по крупицам Грабуном и Бабошкиным команда с приходом Шубенка и Данилевича вначале была великолепно дополнена. Команда получила статус профессионалов и постепенно добивалась результатов, которые переросли в ее выход в высшую лигу. Увы, задержаться там мы смогли всего лишь на год. Наверное, нынешнему тренеру не хватило знаний, чтобы готовить команду классом выше.

"Коммунальник" опустился обратно в первую лигу, откуда вновь вернулся в элиту. Случилось это благодаря вернувшемуся в команду Бабошкину, который доукомплектовал команду уже по ходу чемпионата, эмоционально реагировал на каждый недочет в игре со скамейки запасных, тем самым внося положительные коррективы в игру. А что же делал в это время Шубенок? Он, обычно, не вмешивается в работу футболистов, за которых в большом ответе (или это не понятно?). Но обо всем по порядку.

Как человек, Алексей Шубенок неплохой, но на посту главного тренера, по моему мнению, он не на месте. При нем команда еще ни в одном матче не показала содержательной игры: нет разнообразных тактических уловок, технической подготовки, инициативы в игре. Позвольте тогда задать вопрос: чем же занимается тренер? По-моему, с этим составом команды, который подобрался на сегодняшний день, мы могли бы сражаться за место в восьмерке лучших команд республики. Но парализованная функциональная подготовка и растренированность игроков порой приводит к выражению, которое очень часто звучит из уст зрителя с трибуны: "Шубенка в отставку". И я так же думаю. Когда команда не играет, снимают тренера, или он сам подает в отставку.

Да, я понимаю, что местные парнишки не смогли бы сразу же дополнить игру, внести свои краски, но то, что играли бы так, как выступает сегодня "Коммунальник", это уж точно. И какая была бы перспектива на будущее! Но Алексею Шубенку я бы этих парней не доверил. Сколько прошло через команду молодых, талантливых ребят, и никто не заиграл в настоящий футбол, все стали посредственными игроками!

Хуже уже некуда, как играет команда в 2000 году. Голы если и бывают, то получаются спонтанно... "Домашние" заготовки, есть ли они? Дошло до того, что пара тренеров Шубенок-Данилевич не имеют на бровке даже макета. Так как же вы работаете? Как вы объясняете футболистам их действия?

Комплектование команды и ее тренировочный процесс – это самое главное. Результат же проделанной в этом сезоне работы виден на лицо... Зритель всегда хочет видеть команду, за которую болеет, своей. Слонимских воспитанников в ней – раз два и обчелся. Думаю, что пора задуматься руководству клуба над этим вопросом.

И еще хотелось обратить внимание на состояние газона, на котором играет команда. Жаль, Бабошкин не сдержал своего слова, что во втором круге "Коммунальник" будет играть на стадионе "Юность". Вот и пришлось довольствоваться "слонимским танкодромом" или "слонимской ловушкой", как называет стадион "Динамо" пресса. А ведь стадион – это лицо и визитка клуба.

Юрий ЕВХУТА

Так держать!


Счастливые лица победителей

16 ноября в актовом зале Слонимского РДК проходила игра Клуба Весёлых и Находчивых, в которой принимали участие команды СШ N3, школы-гимназии N1 и санаторно-лесной школы. Был полный аншлаг.

Команды соревновались за выход в полуфинал городского конкурса. Упорная борьба разгорелась между командами СШ №3 и гимназии №1. Жюри было озабочено, кому отдать первое место. И всё же, по итогам всех конкурсов, лучшими оказались ребята из 3-й школы. Призыв болельщиков команды – "Молодцы, так держать!" – был услышан игроками, и они достойно выдержали экзамен на смех и юмор.

В победе ребят есть заслуга преподавательского коллектива СШ №3 и спонсоров команды – управления магистральных газопроводов и фабрики художественных изделий.

Владимир ШИНКЕВИЧ,
психолог СШ №3

ПИСЬМО С "РАССВЕТА" КОММЕНТИРУЕТ ПРЕДСЕДАТЕЛЬ

Пишут Вам колхозники колхоза "Рассвет" Зельвенского района Гродненской области. Мы хотели бы рассказать о наших проблемах. Раньше нам за заработанный трудовой день давали зерно и муку на корм скоту. Так было каждый год. А теперь наш новый председатель Харута В.В. лишил этого половину колхозников. А причина в том, что в приусадебный участок многих входит более 15 соток земли, которая закреплена за сельским Советом и принадлежала людям за много лет до того, как Харута стал председателем. На вопрос: чем кормить домашнюю скотину, он отвечает: "Нечем кормить — сбывайте". Но ведь так же нельзя издеваться над людьми. Ведь мы всё лето работаем как проклятые. Тем, кто работает на ферме, дают дялки свеклы, моркови.

Приезжая вечером с работы в 7 часов вечера, надо бежать за 2-3 км на их прополку, чтобы заработать килограммы зерна. А в итоге — ничего не дали. 70-летние пенсионеры ходят, полют, убирают свеклу за обещанное зерно. Их просто обманули. Люди в отчаянии. С тех пор у людей, у кого нет приусадебного участка, высчитывают деньги за зерно в расчёте с каждого члена семьи.

Посоветуйте, что нам делать?

Просто обо всём в письме не скажешь. Мы вас очень просим: не откажите в нашей просьбе помочь!

Заранее благодарны Деницик К.Е., Мисько В.К., Парфенчик, Кондратеня и др.
Всего 14 подписей

Пракаменціраваць пісьмо калгаснікаў карэспандэнт "ГС" папрасіў старшыню калгса "Рассвет" Зэльвенскага раёна Васіля Харуту. Ён сказаў наступнае: "Няма такіх калгаснікаў у нашай гаспадарцы, якія поўнасцю пазбаўлены збожжа і мукі. Некаторыя атрымалі па 2 тоны і нават болей. Праўда, ёсць тыя, хто атрымаў менш дзвюх тон. Хачу сказаць, што ў нашым калгасе утрымліваецца 5500 галоў жывёлы. Муку і збожжа мы ніколі не прадавалі, а наадварот – яшчэ закупляем. І ў гэтым годзе з-за недахопу збожжа калгас дадаткова ўзяў 112 гектараў зямлі ў калгасе "Перамога" Зэльвенскага раёна, а гэта 56 кіламетраў ад нашай гаспадаркі. Людзям было прапанавана зaараць каля хат траву і пасеяць збожжа. Але не ўсе на гэта пайшлі. Некаторыя вяскоўцы проста патрабуюць: давай збожжа і ўсё. А адкуль мы тое зерне возьмем? Толькі сёлета "Рассвет" здаў дзяржаве 2 тысячы тон. Што датычыць сена для прыватнай жывёлы калгаснікаў, дык ім выдзяляем па 30 сотак кожнаму. Калгас нават косіць траву. Палеткі буракоў вяскоўцы апрацоўвалі і будуць апрацоўваць, іншага выйсця няма. За гэта калгас дае працаўнікам муку, збожжа і грэчку. Сёлета грэчку не атрымаецца даць, а мука будзе. Мы людзей не крыўдзім, дапамагаем тым, чым сёння магчыма дапамагчы".

Сяргей ЧЫГРЫН

НАВІНЫ

Сабе рогі, іншым ногі

Мастоўская паляўнічая гаспадарка, якая лічыцца лепшай у рэспубліцы, прымала гасцей з Бельгіі. Дванаццаці замежным паляўнічым дапамагалі 40 мясцовых жыхароў.

Паляванне праходзіла ў лясах, якія ляжаць на берагах Шчары. У выніку было застрэлена 3 дзікі, 2 ласі і іншая дробная дзічына. Усё, што здабылі, замежныя паляўнічыя пакінулі загоншчыкам, а сабе, па ўмовах кантракту, забралі толькі рогі ласа, кошт якіх, у залежнасці ад памераў, складае да 10000 марак. Аднак гэтыя грошы папоўнілі рэспубліканскі бюджэт.

Бельгійцам спадабалася, і яны паабяцалі на наступны год зноў прыехаць сюды на паляванне.

Першыя ў рэспубліцы

У Магілёве прайшлі спаборніцтвы па валейболу сярод хлопчыкаў і дзяўчынак 1986-1987 гадоў нараджэння.

У іх прынялі ўдзел каманды па месцы жыхарства. Гродзенская вобласць была прадстаўлена камандамі горада Масты. Юных спартсменаў трэніруе Сяргей Кухлей і Вольга Неввяртовіч. Па выніках турніру дзяўчаты заваявалі першае месца, хлопцы – другое. Пераможцы і прызёры былі ўзнагароджаны медалямі і дыпломамі, а таксама ў якасці падарунка атрымалі спартыўныя касцюмы.

Бацькі і дзеці

Мастоўскі райвыканкам занепакоены справамі выхавання дзяцей.

На чарговым пасяджэнні былі агалошаны несуцяшальныя лічбы. Толькі з пачатку бягучага года за неналежнае выхаванне дзяцей да адміністрацыйнай адказнасці было прыцягнута 12 бацькоў, з іх 5 увогуле пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Складзены 31 адміністрацыйны пратакол на дарослых за давядзенне непаўналетніх да стану алкагольнага ап'янення. 4 разы былі выяўлены факты продажу алкагольных напіткаў непаўналетнім. На ўліку ў камісіі па справах непаўналетніх пры райвыканкаме стаіць 70 падлеткаў.

Камітэт занепакоены

Прэс-служба Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці распаўсюдзіла прэсс-рэліз, у якім адзначаецца, што шэраг гаспадарак Мастоўскага і Слонімскага раёнаў не ў поўнай меры выкарыстоўваюць магчымасці падсобных гаспадарак па павелічэнню сельгаспрадукцыі.

У прыватнасці, згадваецца калгас "Кастрычнік" Слонімскага раёна. Там не вядзецца вызначэння якасці малака, а гэта, на думку кантралёраў, зніжае закупкі. Тая ж самая праблема ў калгасе "Чырвоны партызан" Мастоўскага раёна. Гаспадарка за малако разлічваецца са спазненнем на месяц. Між тым асабістыя падсобныя гаспадаркі вобласці даюць 29% мяса і 6% малака ад агульнай іх вытворчасці.

Язэп ПАЛУБЯТКА

ПРЕДПРИНИМАТЕЛИ ГОТОВЫ БОРОТЬСЯ РАДИКАЛЬНЫМИ МЕТОДАМИ

С 1 января 2001 года в Беларуси может начаться всеобщая бессрочная забастовка частных предпринимателей, торгующих на вещевых рынках республики.

Как сообщил БелаПАН координатор Совета организаций предпринимателей Леонид Калитеня, к этой мере предприниматели прибегнут, если власти не прислушаются к требованиям, которые будут выдвинуты в ходе однодневной предупредительной забастовки 23 ноября, а также запланированной на декабрь другой крупной акции (еще одна однодневная забастовка либо митинг).

Предприниматели требуют отменить таможенное оформление ввозимых ими товаров, происходящих из третьих стран и выпущенных в свободное обращение в России, при условии суммарной закупочной стоимости ввезенного товара не выше 3 тысяч минимальных зарплат в месяц. Они протестуют против, по их мнению, неоправданно усложненного порядка осуществления предпринимательской деятельности, конфискации товаров контролирующими органами, повышения фиксированных ставок налога и цен на аренду торговых мест на рынках. По словам Калитени, сейчас месячная аренда "квадратного метра асфальта" стоит 20–25 долларов США, в то время как арендовать "хороший офис" (также квадратный метр) можно за 10–13 долларов США.

"Нынешнее законодательство поставило предпринимателей перед выбором: либо полностью сворачивать деятельность, либо бороться за свои права радикальными методами. Время просьб и надежд прошло. Можно представить, что творится в обычно спокойных регионах, если они выступают с гораздо более решительными заявлениями и предложениями, чем минские предприниматели", – заявил Калитеня.

Дмитрий ВЛАСОВ


Фота IREX/ProMedia

Предприниматели минских рынков сидят на площади стадиона "Динамо" во время двухдневной забастовки 5 мая 1999 г.

У ЛУКАШЕНКО ТАКИХ ДЕНЕГ НЕТ

Как известно, выступая 15 ноября в городском суде Наро-Фоминска (Московская область) по делу об убийстве летом 1998 года депутата Госдумы России, генерала Льва Рохлина, его вдова Тамара Рохлина заявила, что президент Беларуси Александр Лукашенко помогал деньгами ее мужу в подготовке массового мирного выступления силовиков России.

Об этом сообщили российские информационные источники, в том числе телеканал НТВ, а также Интернет-издания, "Газета.Ru" и "Lenta.Ru". Как заявила в своем последнем слове в суде Тамара Рохлина, Лев Рохлин "готовил массовое мирное выступление силовиков России, чтобы решительной демонстрацией заставить кремлевских временщиков слезть с шеи замордованного народа".

По ее словам, об акции протеста знали Геннадий Зюганов, Виктор Илюхин, Альберт Макашов и другие. "Знал о готовящейся акции и президент Беларуси Лукашенко, который помогал моему мужу деньгами для этой цели", – сказала г-жа Рохлина.

"Обычным враньем" назвал Александр Лукашенко эту информацию. Затрагивая тему трагической гибели Льва Рохлина в разговоре с журналистами 17 ноября в Минске, белорусский президент, в частности, сказал: "Я не хотел бы экспромтом влазить в эту тему, она очень щепетильна... Но если я скажу, что я вообще ничего не знаю, это будет неправда. Что я знаю и о чем я предупреждал Рохлина? Все, что я знал, знали и вы: о его позиции, о его ненависти к тому режиму и так далее. Но я его предупреждал, что такие пути решения проблемы недопустимы. Он просился ко мне на прием, и я попросил, может быть, на неделю отложить, поскольку у меня не складывалась ситуация встретиться. Буквально на следующий день утром я услышал, что Лев Рохлин погиб. А финансирование его проектов каких-то... Об этом речи быть не могло, потому что у меня денег нет".

БелаПАН

ШТО Ў НАС ЧЫТАЮЦЬ?

У Мінскім павільёне колішняй ВДНГ (выставы дасягненняў народнай гаспадаркі) праходзіць кірмаш "Свет кніг".

Кошт квітка складае ўсяго 100 рублёў, а чарга наведвальнікаў расцягваецца на некалькі дзесяткаў метраў (**на здымку**). Што ж так вабіць людзей на гэты кірмаш?

Гэта пытанне мы пераадрасавалі генеральнаму дырэктару вытворча-камерцыйнага прадпрыемства "МАКБЕЛ" Дзмітрыю Макараву.

"Наша фірма, – расказвае Дзмітрый Генадзьевіч, – існуе ўжо год і займаецца кніжным гандлем, выдавецкай дзейнасцю і арганізацыяй падобных кірмашоў.

Людзі ідуць на кніжны кірмаш, як і на любы іншы, па адной асноўнай прычыне – цэны тут напалову ніжэйшыя, чым у крамах. Мы працуем без пасярэднікаў.

У выбары асартыменту тавара спрацоўвае непазбежны закон рынку – прадаем тое, на што ёсць попыт. 90% кніжнай прадукцыі завозіцца з Расіі, у асноўным, з Масквы, астатнія 10% – прадукцыя беларускіх выдавецтваў. Але і з гэтых 10% кніжка на беларускай мове сюды не трапляе. Хіба што выпадкова... Вось, скажам, Святлана Алексіевіч атрымала прэмію, але ў кніжным бізнесе яе імя "не раскручана", таму і кніг яе вы ў нас не знойдзеце. Тое самае можна сказаць і пра іншых беларускіх пісьменнікаў...".

Якой толькі літаратуры няма на стэлажах 240 гандлёвых месцаў! Па словах Дзмітрыя Макарава, за адну суботу кірмаш наведваюць больш як пяць тысяч чалавек. І кожны другі выходзіць адтуль з пакупкай. Энцыклапедычная, навуковая, мастацкая літаратура, кніжкі для дзяцей, розныя папулярныя часопісы, падручнікі для сярэдняй і вышэйшай школы, відэа- і аўдэакасеты, канцтавары – на любы густ... Няма толькі на гэтым кірмашы ў сталіцы Беларусі беларускай кніжкі.

Мікола КАНАНОВІЧ,
Віталь ГІЛЬ (фота)



Чарга па кнігі

ГЛАВНОЕ — ОПРЕДЕЛИТЬСЯ С ЕДИНЫМ КАНДИДАТОМ

Уже к концу текущего года демократические силы республики должны определиться с единым кандидатом на предстоящих президентских выборах, а в январе 2001 года — назвать эту кандидатуру. Так считает руководитель координационного совета "Региональная Беларусь" Семен Домаш, который 18 ноября в Бресте вместе с членами совета обсуждал эту проблему.

Отвечая на вопрос корреспондента БелаПАН, Семен Домаш подчеркнул, что сейчас главное – определить стратегию и тактику на предстоящих президентских выборах. Что касается единого кандидата, то называть какие-либо фамилии Домаш не стал, отметив, что сейчас таких кандидатур много: "Проблема – правильно определиться. Этот человек должен соответствовать многим критериям, нравиться людям".

Семен Домаш не исключает, что демократическая оппозиция может выступить с призывом бойкотировать и президентские выборы. Случится это, по его словам, в том случае, если власть не пойдет на определенные уступки (изменения в законодательстве, доступ оппозиции к СМИ, прекращение политических репрессий и т.д.). Отвечая на вопрос, что будет делать оппозиция, если Лукашенко не захочет отдавать власть в случае поражения, Домаш сказал: "В этом случае бояться нечего. Мы сейчас не одни и не изолированы от мира.".

БелаПАН

СІВАКОЎ ПРАЦУЕ Ў АДМІНІСТРАЦЫІ

Былы міністр унутраных спраў Беларусі Юрый Сівакоў нядаўна стаў намеснікам кіраўніка адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі.


Ён будзе займацца арганізацыйнымі і кадравымі пытаннямі. Немалаважным фактарам для Аляксандра Лукашэнкі ў выбары Сівакова было тое, што да яго "нармальна адносіцца апазіцыя". "Гэта мяне задавальняе, – сказаў Лукашэнка Сівакову. – Яны ж увесь час вас абаранялі, нібыта я нападаў на вас, яны вас абаранялі ад мяне. Хай ведаюць, што я не баюся, прызначаю ча на гэтую работу чалавека, да якога яны добра адносяцца".



Алег ТАЧОНЫ

"РУССКОЯЗЫЧНЫЙ БЕЛОРУССКИЙ НАЦИОНАЛИЗМ"

В Минске в Центральной библиотеке имени Янки Купалы прошла презентация книги исследователя Алеся Белого "Хроніка Белай Русі. Нарыс гісторыі адной геаграфічнай назвы".



Книга, недавно вышедшая тиражом в одну тысячу экземпляров в библиотеке журнала "Беларускі гістарычны агляд", является первой попыткой "сквозной" реконструкции истории названия "Белая Русь", определения его места в системах географических топонимов разных народов и эпох. Исследование опирается на детальный анализ текстовых и картографических источников VII–XVIII веков, находящихся в архивах и библиотеках Беларуси, Венгрии, Великобритании, Германии, Польши и Швейцарии.

Несмотря на то, что "Хроніка Белай Русі" издана на белорусском языке, исследователь убежден, что русский язык останется основным в Беларуси еще на протяжении примерно полувека. Вот почему, по его мнению, необходимо выпускать как можно больше популярной русскоязычной исторической литературы, подготовленной на высоком уровне. Такие издания, как считает Белый, не только удовлетворят интерес русскоязычных белорусов к отечественной истории, но и "смогут привести этих людей к русскоязычному белорусскому национализму". При этом он отметил, что многим жителям страны намного легче считать себя русскими, чем радикально изменить свое мышление и прийти ко всему тому творческому наследию, которое создано белорусской национальной интеллигенцией. "Если бы краеугольным камнем белорусской идеи была не мова, а III Статут Великого княжества Литовского, тогда сторонников национального возрождения было бы намного больше", – заключил Белый.

Марат ГОРЕВОЙ

ДЕНЕЖНАЯ ЕДИНИЦА — ОДНА НА ДВОИХ

На предстоящем 30 ноября в Минске заседании Высшего государственного совета Союзного государства будет принято окончательное решение о подписании межгосударственного соглашения о введении на территории Беларуси и России единой денежной единицы и формирования единого эмиссионного центра.

Об этом было заявлено на пресс-конференции по итогам заседания Совета министров Союзного государства, состоявшегося 14 ноября в Москве.

По словам премьер-министра России Михаила Касьянова, в ходе отработки проекта межгосударственного соглашения было принято решение: в течение ближайших двух недель уточнить ряд юридических процедур, необходимых для подписания этого документа. Соглашением предусматривается, что с 1 января 2005 года на территории двух государств в качестве единого платежного средства будет использоваться российский рубль, а с 1 января 2008 года будет введена единая валюта Союзного государства. "Какая это будет валюта и будет ли ею российский рубль, сегодня этот вопрос не обсуждался", – сказал Касьянов.

БелаПАН

на жыццёвых скрыжаваннях

Я помню дзіўнае імгненне...


Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Прыгарадны цягнік ад'ехаў ад гарадской станцыі. Пасажыры ўладкаваліся на сядзеннях і наважыліся, кожны пасвойму, бавіць час у дарозе. Непадалёку ад мяне сядзелі і размаўлялі дзве кабеты сталага ўзросту. Адна з іх, мажная, у мужчынскім суконным фрэнчы, гаварыла густым басам. Пафарбаваныя ў цёмна-рыжы колер валасы пасмачкамі павылазілі з-пад хусткі, акаймляючы поўны абветраны твар.

У тамбуры, непадалёку ад якога мы сядзелі, запішчала парася.

— Міша, супакой ты іх! — гнеўна крыкнула кабета мужчыну, які стаяў пры мяшку.

Не ведаю, што там зрабіў Міша, але парася пішчаць перастала.

— Гэй! Хто будзе ў карты гуляць? Нам аднаго чалавека не хапае, — падняўся з суседняга сядзення малады хлопец.

— Я буду! — па-школьнаму падняла ўгору руку мажная кабета.

Выходзіла так, што мне трэба было памяняцца з ёй месцамі, бо ўсім ігракам не было дзе сесці. Пусціла яе, але сама сесці не асмельвалася: усё сядзенне было вільготным.

— Сядайце, тут чыста, — прыязна паведаміла сяброўка карцёжніцы. — А што мокра, дык газетку падсцяліце. Гэта Міхайлаўна прамокла ўся на кірмашы, парасяты прадаючы. І трэба ж, так не шанцуе людзям: трэцюю нядзелю возяць і ўсё ніяк не прададуць. Было дзве пары, то адну тыдзень назад збылі, а гэту ніхто не бярэ. Праўда, яны і хочуць нямала. Значна даражэй той цаны, за якую аддаюць такіх парасят іншыя гаспадары. Дорага хочуць, — апавядала гаваркая жанчына. — Сама Міхайлаўна во ў карты гуляць уселася, а муж пры парасятах вартаўніком стаіць. І так кожны раз, — нібыта асуджала яна сваю сяброўку.

— Чым ты ходзіш, недарэка, чым ты ходзіш?! — закрычала ледзь не на ўвесь вагон мажная кабета. Гэтак заўсёды ў дурнях застанешся.

— Во дае цётка! — засмяяўся мужчына з пярэдняй лаўкі. — Паглядзіш, дык нібы ўсё жыццё тым і займалася, што ў карты гуляла. Лепш за іншага мужыка.

— Не тым займалася, — даверліва паведаміла мне жанчына-суседка. — Настаўніца яна. Цяпер на пенсіі, але ўсё роўна яшчэ працуе. Праўда, не ў той школе, што некалі. У іншай.

І тут на мяне нібы найшло нейкае прасвятленне і ачмурэнне адначасова.

— Яе завуць Вікторыя Міхайлаўна? — пытаю.

— Так, правільна. А што, ведаеце яе? — на твары жанчыны адлюстравалася вялікая цікавасць.

— Амаль што не. Проста, сустракаліся некалі.

Чамусьці не магла ёй сказаць, што гэта мая былая настаўніца рускай мовы і літаратуры, якую не бачыла каля сарака гадоў. Я не проста любіла яе і прадмет, які яна выкладала. Душа была зачаравана і палонена настаўніцай. Ёй вельмі пасаваў зялёны колер, і Вікторыя Міхайлаўна аддавала яму перавагу. І блузачкі, і сукенкі былі ў яе заўсёды дабротныя, модныя, і мы, вясковыя дзяўчынкі, якія больш нічога не ведалі, акрамя паркалю ды штапелю, пазіралі на яе з вялікім захапленнем.

Была яна не толькі прыгожая і мажная, але і ўладарная. Мела зычны голас і не прамінала выпадку павысіць яго. Калі хто-небудзь з вучняў не так сябе паводзіў — магла высмеяць, нават абразіць. Нягледзячы на гэта, у школе яе любілі, бо на ўроках Вікторыя Міхайлаўна была багіня, чараўніца. Сорак пяць мінут пралятали як адна, і мне заўсёды было шкада, што ўрок заканчваецца.

Як цудоўна яна чытала нам вершы Пушкіна, Някрасава, Фета! Ад яе мы даведаліся не толькі пра тое, што напісана ў школьных падручніках, а пра многае, аб чым у сельскай бібліятэцы прачытаць немагчыма.

Божа мой, як яна чытала вершы!

Я помню чудное мгновенье
Передо мной явилась ты…

Пастава, голас, міміка былі прапізаны дзівосным незямным святлом. І замірала душа, каб потым раптоўна ўзляцець да столі вясковай школкі, а думкі навыперадкі беглі ў зусім блізкае ўжо юнацтва, каб хоць на імгненне зазірнуць на той таямнічы востраў, які дарослыя называюць каханнем…

Яна была гараджанка, вельмі адукаваная дзяўчына, ужо ў гадах, і мы аднойчы незнарок падслухалі, як сельскія настаўнікі гаварылі пра нейкую асабістую драму нашай дзівоснай Вікторыі Міхайлаўны. Але ў гэтым мы тады нічога не разумелі ды і не маглі разумець.

Не ведаю, як хто, а я пераняла ад яе многае: і добрае, і дрэннае. Цяпер, з вышыні пражытых гадоў, гэта вельмі прыкметна…

Вікторыю Міхайлаўну зусім вывеў з цярпення няўдалы карцёжны партнёр, і яна, кінуўшы карты на лаўку, падалася ў тамбур, паглядзець, як там маюцца Міша з парасятамі.

— Добрая кабета, але не пашанцавала ў жыцці, — прамовіла жанчына-суседка. — Мы побач жывём, то я на сабе зведала яе вялікую дабрыню. Але і рэзкая бывае. Мішу свайго, як кажуць, у грош не ставіць, бо ён моцна выпівае. І адзіны сын у бацьку пайшоў. З жонкай развёўся, да бацькоў жыць прыехаў. Абодвух трымае на сваіх плячах Вікторыя Міхайлаўна, ды яшчэ нявестцы дапамагае ўнукаў гадаваць. Таму і трасецца над кожнай капейкай. Лёс такі, нічога не зробіш.

Мне так хацелася падысці да яе, зазірнуць у вочы, прызнацца, што пазнала, што ніколі не забывала яе ўрокі і яе самую — маладую, прыгожую, у моднай зялёнай сукенцы. Але не адважылася. Думала, можа, яна мяне не прыпомніць. Сорак гадоў прайшло... Ці мала было ў яе вучняў! Хіба ўсіх запомніш? Даўно пазарасталі травой тыя сцежкі, па якіх мы некалі хадзілі. Новыя людзі пратапталі новыя дарожкі…

Нечакана пад'ехалі да невялічкай станцыі, дзе жыла Вікторыя Міхайлаўна. Яны з мужам выйшлі з цягніка. Ён узяў на плечы мяшок з парасятамі, і абое пакрочылі па размяклай ад восеньскіх дажджоў дарозе.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ПОЛЬШЧА — ПРЫЯЗНАЯ СУСЕДКА БЕЛАРУСІ

Мы, беларусы, жывём з Польшчай у адным еўрапейскім доме, і нават, можна сказаць, у адным пад'ездзе гэтага вялікага дома.

На працягу ўсёй нашай гісторыі мы былі арганічна звязаны вельмі падобным гістарычным лёсам, барацьбой за сваё існаванне, блізкай культурай і самымі цеснымі гаспадарчымі сувязямі.

